ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 1 2000
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## ГІСТОРЫЯ

*УДК 329.1./6(476)*

*М. М. ЗАБАЎСКІ*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАЗІЦЫІ ДЭПУТАТАЎ АД БЕЛАРУСІ Ў II РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ

У дадзеным артыкуле ставіцца мэта на аснове шырокага кола архіўных матэрыялаў і пер- шакрыніц раскрыць пазіцыі ў II Думе прадстаўнікоў урадавых партый ад Беларусі, праа-налізаваць пазіцыі польска-беларускіх аўтанамістаў і паказаць адносіны беларускага нацыя- нальнага руху да дзейнасці Расійскага «парламента».

У беларускай гістарыяграфіі гэта тэма разглядалася ў працах М. В. Біча [1].

II Дзяржаўная дума пачала работу 20 лютага 1907 г. Але задоўга да гэтай даты лідэры партый і груп, якія трапілі ў «парламент», разглядалі магчымыя варыянты стварэння трывалых блокаў для будучай думскай дзейнасці, для выбараў прэзідыума і старшыні Думы. У выніку ім стаў кадэт Ф. А. Галавін, які атрымаў падтрымку з боку трудавікоў. Апошнія мелі 104 мандаты, і нават у выніку іх поўнага саюзу з сацыял-дэмакратамі (65 дэпутатаў), эсэрамі (37) і энэсамі (16) атрымлівалася меншасць — 222 галасы. Саюз з часткай кадэтаў (усяго 98) даваў пэўную перавагу трудавікам над правымі. Да думскіх трудавікоў далучыўся і дэпутат ад Гродзенскай губерні беспартыйны А. М. Санцэвіч [2; 3]. Колькасць членаў трудавой групы магла б павялічыцца і за кошт беспартыйных сялян-дэпутатаў ад Гродзенскай і Магілёўскай губерняў. Але з мэтай іх «ізаляцыі» Р. А. Лашкароў В. А. Якубовіч стварылі ў Думе самастойную парламенцкую групу «беспартыйных» сялян. Цікава, што за гэту справу ўзяліся буйны землеўладальнік і праваслаўны святар з Мінскай губерні, ад якой у Думу быў прадстаўлены самы «паказальны» для ўрада склад дэпутатаў ад сялян. Вопыт выбарчай кампаніі ўлічваўся і ў Дзяржаўнай думе [4].

Р. А. Лашкароў разам з У. М. Пурышкевічам, В. В. Шульгіным, У. А. Бобрынскім і іншымі ўвайшоў у лік найбольш яркіх правых прамоўцаў II Думы. Яны «не давалі спуску» левым: пратэставалі супраць рэвалюцыйных выпадаў з думскай трыбуны, гучна віталі прадстаўнікоў урадавых партый. Тон выступленням апошніх надаў Старшыня Савета міністраў П. А. Сталыпін. 6 сакавіка 1906 г. ён выступіў з дэкларацыяй і разгарнуў шырокі план рэформ.

Акрамя законапраектаў агульнага характару, якія вызначалі абавязкі і правы грамадзян Расійскай імперыі, П. А. Сталыпін прапанаваў Думе шэраг законапраектаў, якія закранаді перабудову мясцовага жыцця (зямельных таварыстваў, пасялковага, валаснога і павятовага кіравання) на новых пачатках. У галіне самакіравання прадугледжваўся перагляд пытанняў земскага і гарадскога прадстаўніцтва, пытання аб яго кампетэнцыі і адносін да органаў самакіравання з боку адміністрацыі.

П. А. Сталыпін падкрэсліў, што планавалася ўвядзенне самакіравання ў Прыбалтыйскім і Заходнім краях і Царстве Польскім на агульных асновах, «за выдзяленне ў асобную адміністрацыйную адзінку мясцовасцей, у якіх канцэнтравалася рускае насельніцтва» [5].

Вырашэнне аграрнага пытання Старшыня Савета міністраў звязваў таксама з паляпшэннем форм землекарыстання, у сувязі з чым меркавалася развіццё і арганізацыя зямельнага, меліярацыйнага і перасяленчага крэдытаў.

Рэформы рабочага заканадаўства прадугледжвалі больш шырокія правы прафсаюзаў, увядзенне страхавання рабочых на выпадак хваробы, інваліднасці ці па старасці [5, стб. 116].

Прэм'ер акцэнтаваў увагу на сутнасці ўказа ад 9 лістапада 1906 г., які прадугледжваў захаванне памешчыцкага землеўладання і разбурэнне сялянскай абшчыны з перадачай надзельнай зямлі ў асабістую ўласнасць сялян.

Адказ на дэкларацыю павінен быў вызначыць адносіны фракцый да ўрада і тую тактыку, якой кожная з іх планавала прытрымлівацца ў Думе.

Кадэты адказалі маўчаннем, пазбягаючы якіх-небудзь выказванняў супраць урада, а затым галасавалі за пераход да павесткі дня без абмеркавання. Сацыял-дэмакраты і трудавікі заявілі, што лічаць немэтазгодным абмяркоўваць дэкларацыю П. А. Сталыпіна, паколькі ўся краіна «... сваім галасаваннем дакладна выразіла сваё меркаванне наконт дзеянняў палітыкі ўрада» [6]. П. А. Сталыпіна сталі абараняць акцябрысты В. В. Шульгін (Валынская губ.) і І. П. Сазановіч (Магілёўская губ.). Апошні абураўся паводзінамі дэпутатаў левых партый, назваўшы іх ворагамі «рускай дзяржаўнасці», і заявіў, што схіляе галаву перад урадам, які падрыхтаваў і плануе правесці ў жыццё складаную праграму рэформ [5, стб. 145—148, 150—152].

У параўнанні з І Думай кадэцкая фракцыя актывізавала ідэйна-палітычную барацьбу супраць трудавікоў і сацыял-дэмакратаў. Разам з тым кадэты не згаджаліся на супрацоўніцтва з П. А. Сталыпіным, паколькі гэта азначала б адмову ад уласнай праграмы. Іх не задавальняла ні сама праграма, ні тым больш гвалтоўныя шляхі яе рэалізацыі.

Галоўнымі прамоўцамі па аграрнаму пытанню былі А. І. Шангароў (г. Варонеж) і Н. Н. Кутлер (СПб.). Кадэты выключылі са свайго аграрнага праекта «42-х», унесенага ў І Думу, пункт аб стварэнні дзяржаўнага зямельнага фонду, пашырылі пералік неадчужальных памешчыцкіх зямель (паказальныя, племянныя і інш. гаспадаркі). Яны прапанавалі праект выкупу прыватнаўласніцкіх зямель па справядлівай ацэнцы (у залежнасці ад таго, які прыбытак дае зямля пры яе гаспадарчай эксплуатацыі) за кошт дзяржавы і паловы сродкаў за кошт сялянства [5, стб. 1347—1358]. Н. Н. Кутлер меркаваў плаціць землеўладальнікам узнагароджанне за прымусова адчужаемыя землі ў памеры 80 рублёў за дзесяціну [5, стб. 1197—1205].

Фракцыя трудавікоў унесла свой аграрны законапраект, які падпісалі 113 дэпутатаў. Праект амаль супадаў з «Праектам 104-х». 16 параграфаў з 20 былі ўнесены адразу, 4 — пазней за подпісамі 37 дэпутатаў-эсэраў. Па аграрнаму пытанню ў Думе выступілі 10 членаў фракцыі. Яскравымі фактамі з асабістага жыцця і непасрэдных назіранняў трудавікі адвяргалі заявы ўрада і правых. Яны лічылі, што ўказ ад 9 лістапада аб знішчэнні абшчыны выклікае тое, што землі ў рэшце рэшт будуць належаць заможным сялянам. «Нас чакае развіццё, з аднаго боку, сельскай буржуазіі, апоры рэакцыі, да таго па сутнасці і імкнуцца выдадзеныя законапраекты, — заяўлялі яны, — з другога — вясковага пралетарыяту. Затое будзе замацаваны прынцып прыватнай зямельнай уласнасці, і памешчыкі прададуць свае маёнткі па высокаму кошту» [6, арк. 24—26].

Дэпутат А. М. Санцэвіч заявіў «Чаму мы павінны купляць свае землі: ці мы ж іншаземцы? Яны намі 10 разоў ужо апрацаваны потам, крывёю і грошамі. Нам не патрэбна кіраўніцтва з боку памешчыкаў». У канцы прамовы ён абвясціў: «чаму сяляне гінуць без хлеба, калі памешчыкі яго вывозяць за мяжу? Святары павінны богу маліцца, а яны займаюцца землеробствам. Неабходна забраць зямлю і ў тых, і ў другіх».

Дэпутаты-эсэры прапанавалі праграму, у аснову якой быў пакладзены праект, які павінен быў разглядацца ў І Думе. У праграме прадугледжвалася «адмена ўсякай прыватнай уласнасці на зямлю, незалежна ад таго, каму зямля належыць — прыватным асобам, абшчыне, ці дзяржаве. Зямля павінна стаць даступнай для свабоднага карыстання ўсіх грамадзян».

«Зямля з усімі яе нетрамі і водамі перадаецца народу без выкупу, у роўнае карыстанне, прычым роўнае землекарыстанне абмяжоўваецца рамкамі не ніжэй спажывецкай і не вышэй працоўнай нормы, — заяўлялі дэпутаты-эсэры» [7].

Эсэраўскія кіраўнікі, якія тлумачылі сялянам сутнасць царскага ўказа ад 9 лістапада 1906 г., заяўлялі, што ў грамадах, дзе даўно не было перадзелаў, домаўладальнікі, якія маюць больш зямлі, чым патрэбна па колькасці душ у іх сем'ях, вылучацца, пакінуўшы шматсямейных без зямлі. Асабліва іх турбавала тое, што многія землі трапяць у рукі міраедаў. Яны спойваннем, за пазыкі ці іншымі шляхамі будуць скупляць надзелы ў слабых домаўладальнікаў. А атрымаўшы абшчынныя землі, міраеды будуць дакучаць таварыства штрафамі, адпрацоўкамі і кабальнай арэндай.

«Асабліва важна сялянству не дапускаць выдзялення ўчасткаў ва ўласнасць асобным гаспадарам, — пісала «Земля и воля», — трэба спачатку навучыць угаворамі. Калі заявы на выдзяленне паступяць ад сялян — адмаўляць ім. А старастам забараняць прымаць такія заявы» [8]. Сялянам тлумачылі, што ні адзін з царскіх указаў не мае сілы закона і яны не павінны звязвацца з землеўпарадкаванымі камісіямі, не набываць ніякіх зямель, не закладваць сваіх зямель, не выдзяляцца з таварыстваў.

Заметную актыўнасць у пачатку заканадаўчай працы ў Думе прадэманстравалі сялянскія дэпутаты ад Беларусі, якія належалі да «Русского окраинного союза» (РОС). Сяляне Мінскай губерні А. А. Краскоўскі і В. М. Мельнік заклікалі «народных прадстаўнікоў», нягледзячы на партыйную

прыналежнасць, «імкнуцца мірным шляхам вырашыць патрэбы народа». «І гэтага нам можна дасягнуць, — заяўляў А. А. Краскоўскі, — калі кожны гараджанін будзе Мініным, кожны вайсковец — Пажарскім, кожны селянін — Іванам Сусаніным» [5, стб. 156]. Праз два дні «Минское слово» пісала: «Дарагія нашы дэпутаты! Мінскі рускі перадвыбарчы сход выказвае вам шчырую падзяку за прамовы і мы ганарымся тым, што ёсць дастойныя прадстаўнікі ў Думе ад нашай губерні» [9].

Выступленні правых сялян зводзіліся да малазямелля і патрабаванняў дадатковага надзялення зямлёю на правах уласнасці. «Свой дабрабыт і дастатак, — заяўляў П. Ф. Грудзінскі (Мінская губ.), — сяляне бачаць у дадатковым надзяленні зямлёй на правах уласнасці, а не на праве валодання ці на праве карыстання» [5, стб. 1811—1812]. За напісанне такога закона, які б дазволіў закрануць і прыватнаўласніцкія землі, за ліквідацыю малазямелля за кошт казённых, удзельных, кабінецкіх, царкоўных і манастырскіх зямель выступіў у II Думе селянін Ф. І. Петрачэнка (Віцебская губ.) «Патрэбы і гора сялян, — сказаў Ф. І. Петрачэнка, — ад малазямелля, і колькі спрэчак не вядзіце, другога зямнога шара не створыце. Прыйдзецца, значыць, гэту зямлю нам (сялянам — *М. З.*) аддаваць». У той час яны выказвалі сваю гатоўнасць да канца «абараняць веру, цара і айчыну ад ворагаў знешніх і ўнутраных» і адвяргалі патрабаванне польска-беларускіх паноў аб аўтаноміі края [5, стб. 1614—1616].

Сялянскія дэпутаты ад Мінскай губерні, якія ў Думе далучыліся да фракцыі правых, выступілі супраць любых прапаноў аб тым, каб галоўныя пытанні жыцця вёскі вырашаліся не ў Думе, а «дзе-небудзь у польскім сейме, у Варшаве, Вільні ці Мінску». «Калі аграрнае пытанне будзе вырашацца ў польскім сейме, — заявіў дэпутат В. М. Мельнік, — то яно прынясе горкія вынікі» [5, стб. 1101—1105].

Селянін А. А. Гаўрыльчык прысвяціў сваё кароткае выступленне аналізу прамовы Р. В. Дмоўскага. Ён запэўніваў прысутных, што аўтаномія ў паўночна-заходнім краі патрэбна толькі буйным памешчыкам, а аграрнае пытанне можна вырашыць перадачай некаторай часткі зямель польскіх памешчыкаў «рускім» сялянам [5, стб. 1510—1511]. Дэпутат А. А. Краскоўскі заявіў: «Не патрэбна нам такога самакіравання, якога жадаюць палякі і якое ўсю ўладу перадасць у рукі памешчыкаў. Нам не патрэбна і школ, якія маюць сваёй мэтай падпарадкаванне чыста праваслаўнага насельніцтва польскаму ўціску і пераводу праваслаўных у католікаў» [5, стб. 2131—2134].

Салідарны з імі быў і рускі памешчык Р. А. Лашкароў, які абвінавачваў польскіх нацыяналістаў у імкненні захапіць Паўночна-Заходні край [5, стб. 2131—2134].

Правыя сяляне былі аднадушны ў тым, што задаволіць патрэбы беларускага праваслаўнага сялянства можна і неабходна за кошт польскіх памешчыкаў. «Мы — сяляне, просім памешчыкаў, каб яны далі зямлю не гвалтам, а мірным шляхам — па справядлівай ацэнцы», — гаварыў А. І. Шыманкі. А землі тых польскіх памешчыкаў, якія не пагадзяцца, дэпутат прапанаваў абкласці вялікімі падаткамі [5, стб. 1616—1618].

Прычынамі раз'юшаных выступленняў правых сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі было апасенне, што з увядзеннем мясцовага самакіравання правядзенне аграрнай рэформы будзе перададзена польскім аўтанамістам.

Неабходна адзначыць, што думскія прамовы правых дэпутатаў ад заходніх губерняў карэкціраваліся «даволі адукаванымі настаўнікамі». «Дапамогу дэпутатам» па гісторыі края аказваў адзін з заснавальнікаў «РОС», рэдактар газеты «Окраины России» П. Р. Бывалькевіч. Ён у той час пражываў у сталіцы на вуліцы Гарохавай, 24 [10].

Урад загадзя ведаў, што ў выпадку непадпарадкаванасці ўладам і непрацаздольнасці II Дума будзе распушчана, а выбарчы закон зменены. Склад дэпутатаў быў нечаканым для ўрада. Каля 80 дэпутацкіх месцаў страцілі кадэты і разам з прымкнуўшымі да іх мусульманамі яны складалі крыху больш адной пятай часткі дэпутатаў. Але кадэцкі корпус стаў больш радыкальным. Ад 5 заходніх губерняў кадэты былі прадстаўлены двума дэпутатамі. Роля цэнтра перайшла да Польскага кола; калі яно аб'ядноўвала галасы з сацыял-дэмакратамі (55 месцаў), кадэты і правыя былі ў меншасці. Аўтанамісты атрымалі 30,6 % месцаў у заходніх губернях. Фракцыя «правых» у Думе складалася з 54 дэпутатаў. Урадавыя партыі атрымалі адну пятую частку дэпутацкіх месцаў. Сярод 36 дэпутатаў ад Беларусі правыя складалі 41,7%. II Дума ўжо не была такой кансалідаванай, як першая. Яна не мела трывалай большасці.

Калі 6 сакавіка П. А. Сталыпін выступіў з дэкларацыяй і разгарнуў план рэформ, адразу адчулася перамена ў параўнанні з часамі І Думы: ніхто не заклікаў да адстаўкі. Яго заключныя словы былі сустрэты апладысментамі справа, а фракцыі думскай большасці ў якасці дэманстрацыі вырашылі ўстрымацца ад дэбатаў і прыняць просты пераход да чарговых спраў.

Але з гэтым не пагардзіліся сацыял-дэмакраты; іх прамоўцы выступілі з рэзкімі нападкамі на ўрад. На кожнае выступленне сацыял-дэмакратаў адказвалі некалькімі прамовамі правыя. Многія пасяджэнні былі прысвечаны парадку абмеркавання бюджэту, а таксама праграмным выступленням дэпутатаў па аграрнаму пытанню.

Кадэты значна актывізавалі сваю дзейнасць ў супрацьстаянні трудавікам і сацыял-дэмакратам і ў той жа час пашырылі пералік неадчужальных зямель і прапанавалі праект выкупу прыватнаўласніцкіх зямель па справядлівай ацэнцы.

Трудавікі і эсэры па-ранейшаму выступалі за перадачу зямлі ва ўласнасць усяму народу без выкупу, за роўнае карыстанне, абмежаванае рамкамі не ніжэй спажывецкай і не вышэй працоўнай нормы.

Правыя сяляне ад Беларусі заклікалі «народных прадстаўнікоў» мірна вырашаць пытанні і ў той жа час гаварылі аб малазямеллі і прапаноўвалі дадатковае надзяленне сялян зямлёй на правах уласнасці. Асабліва вызначыліся дэпутаты Мінскай губерні А. А. Краскоўскі, В. М. Мельнік, П. Ф. Грудзінскі і прадстаўнік Віцебшчыны І. І. Петрачэнка. Яго прамова ў Думе была класічнай для правых, праваслаўных, заможных сялян. Яна ўключала і веру ў цара і патрабаванне зямлі, у першую чаргу за кошт польскіх землеўладальнікаў. Для гэтай катэгорыі сялянства заходніх губерняў увядзенне органаў мясцовага самакіравання было б выгадным, але яны апасаліся, што ў гэтым выпадку, улада пяройдзе ў рукі палякаў і яны на месцах будуць вырашаць лёс аграрнага пытання. З гэтай нагоды правыя сяляне ў катэгарычнай форме выступалі супраць «самакіравання», якое прапаноўвалі польска-беларускія аўтанамісты. «Русский окраинный союз» каардынаваў дзеянні і ганарыўся паводзінамі ў Думе правых дэпутатаў, падтрымліваючы іх у сваіх органах друку.

Рускія памешчыкі ад Беларусі падтрымлівалі сялянскіх дэпутатаў у імкненні вырашыць аграрнае пытанне часткова за кошт польскіх памешчыкаў, а таксама прапаноўвалі іншыя шляхі. Яны заключаліся ў паляпшэнні апрацоўкі зямлі, у асваенні балоцістых, пясчаных і іншых тэрыторый.

10 мая П. А. Сталыпін выступіў з рэзкай крытыкай унесеных кадэтамі, трудавікамі, сацыял-дэмакратамі праектаў. Апошнія словы яго прамовы набылі шырокую вядомасць. «У гэтай справе (рэформ. — *М. З.*) патрэбна цяжкая чорная праца, — гаварыў ён. — Мы прапануем вам сціслы, але дакладны шлях. Ворагі дзяржаўнасці імкнуцца выбраць шлях радыкалізму, адмовы ад гістарычнага мінулага Расіі, забыцця яго культурных традыцый. Ім неабходны вялікія ўзрушэнні, нам патрэбна вялікая Расія».

Дэпутаты-палякі ад заходніх губерняў М. А. Вянслаўскі, граф Л. С. Путкамер, М. Г. Хялкоўскі, Г. К. Дымша, А. С. Хамінскі, граф А. Ф. Лубенскі, ксёндз Л. К. Радзевіч, С. С. Ячыноўскі, М. М. Беніслаўскі, С. А. Ванькові́ч, С. В. Пілейка і В. К. Лісоўскі (Падольская губ.) стварылі Кола польскіх дэпутатаў-канстытуцыяналістаў Літвы і Русі, рэгламент дзейнасці якога быў зацверджаны 26 лютага 1907 г. Старшынёй Кола быў абраны дэпутат ад г. Вільні М. А. Вянслаўскі, віцэ-старшынямі Л. Ф. Лубенскі (Магілёўская губ.) і Г. К. Дымша (Віцебская губ.) [4]. Прапанова Л. С. Путкамера аб уваходжанні ў Польскае кола была адхілена, але для ўзгодненых агульных пазіцый дэпутатаў Каралеўства Польскага, Беларусі і Літвы былі створаны аграрная, школьная, канстытуцыйная і іншыя камісіі.

Па аграрнаму пытанню польскія дэпутаты вырашылі адстойваць агульную пазіцыю, што правядзенне аграрнай рэформы магчыма толькі пасля рэформы самакіравання, але разыходжанні заключаліся ў тым, што Польскае кола пагаджалася «ў выніку неабходнасці» на адчужэнне за выкуп дзяржаўных, кляштарных і часткі прыватных зямель. Прадстаўнікі Кола польскіх дэпутатаў-канстытуцыяналістаў Літвы і Русі не дапускалі нават такіх меркаванняў і рашуча адстойвалі права прыватнай уласнасці на зямлю [11]. Такім чынам, польскія дэпутаты ад 5 заходніх губерняў трывала занялі месца сярод аўтанамістаў і адхілілі прапановы правых і акцябрыстаў аб сумесных дзеяннях.

Кадэцкая «Речь» пісала, што «палякі дзейнічалі ў Думе адзіным строем, калі і выпускалі прамоўцаў, то толькі для групавых заяў» [12]. Гэта тлумачылася тымі абставінамі, што толькі з дазволу Кола дэпутаты маглі выступаць у Думе. Першым «табу» парушыў С. А. Ваньковіч, асудзіўшы тэрор, калі і Польскае кола, і Кола канстытуцыяналістаў галасавалі супраць прыняцця Думай рэзалюцыі з асуджэннем рэвалюцыйнага тэрору.

Пры абмеркаванні аграрнага пытання ад імя польскай групы, г. зн. «ад палякаў — прадстаўнікоў Царства Польскага і суседняй з ім заходняй часткі дзяржавы, так званага Паўночна і Паўднёва-заходняга края» на думскую трыбуну падняўся лідэр эндэцыі Р. Дмоўскі. Ён фактычна падтрымаў урадавую праграму, прызнаўшы, што «аграрнае пытанне існуе, і малазямел-

ле з'яўляецца язвай нашага жыцця». Р. Дмоўскі паведаміў аб тым, што адным з першых пунктаў сацыяльнай праграмы Кола з'яўляецца павелічэнне плошчы сялянскага землеўладання. Далей дэпутат выказаў меркаванне, што пры правядзенні аграрнай рэформы неабходна ўлічваць асаблівасці розных рэгіёнаў краіны. Спыніўшыся на Літве, лідэр эндэцыі нагадаў, што гэта край мураўёўскіх «гальштукаў» і падкрэсліў, што ніводная частка імперыі не ўяўляе такога поля дзейнасці для бюракратычных злоўжыванняў, і дзе развал грамадскага жыцця даведзены да крайнасці. «А паколькі зямельныя адносіны края адрозніваюцца ад становішча вялікарускага цэнтра, то, на думку Р. Дмоўскага, неабходна, каб аб лёсе аграрнага пытання выказалася і мясцовае насельніцтва ў адпаведных установах, якіх яно пакуль пазбаўлена» [5, стб. 743—744]. Такім чынам, ён выказаўся за дэцэнтралізацыю ўлады: «пры такой арганізацыі выканаўчай улады, пры яе існуючых адносінах з заканадаўчымі ўстановамі, пры недахопе законаў, забяспечваючых агульнаграмадзянскія свабоды, пры нераўнапраўі нацыянальнасцей і веравызнанняў, пры пазбаўленні вялікіх тэрыторый дзяржавы земскага кіравання, ніякая грамадзянская рэформа не можа быць праведзена ў яе першапачатковым, не скажоным выглядзе», — заявіў Р. Дмоўскі [5, стб. 742—748]. Ён адзначаў, што аграрнае пытанне на Беларусі і Літве магло быць вырашана толькі пасля ўвядзення земстваў, заснаваных на роўнасці ўсіх грамадзян без уліку іх паходжання і веравызнання.

Кола польскіх дэпутатаў-канстытуцыяналістаў Літвы і Русі цалкам падтрымала выступленне Р. Дмоўскага, а затым унесла ў Думу законапраект аб аўтаноміі Каралеўства Польскага.

Абмеркаванне фактычна ўсіх разглядаемых у II Думе законапраектаў Кола зводзіла да неабходнасці ўвядзення мясцовага самакіравання ў заходніх губернях. Дэпутат А. С. Хамінскі прадстаўляў інтарэсы палякаў пры разглядзе праекта ўвядзення ў Расіі ўсеагульнай пачатковай адукацыі: «Клопаты аб школе павінны быць у руках органаў мясцовага самакіравання, — заявіў ён, — толькі ў гэтым выпадку мясцовае насельніцтва можа цалкам задаволіць свае патрэбы ў адукацыі». Дэпутат спыніўся на тым, што пакуль гэтыя патрабаванні ігнаруюцца. У доказ ён прывёў прыклад аб адсутнасці фінансавання на выкладанне ў гімназіях польскай і літоўскай моў і свабоды ў адкрыцці прыватных школ [14, стб. 148—153].

2 чэрвеня М. А. Венслаўскі выступіў пры абмеркаванні асноўных палажэнняў законапраекта аб мясцовым судзе. Ад імя дэпутатаў Заходняга края ён заявіў, што далучаецца да праекта асноўных палажэнняў мясцовага суда. Паколькі А. С. Хамінскі, стаўленік Кола, тут жа падкрэсліў, што «адсутнасць земскіх устаноў — гэта мель, на якой мы будзем сядзець кожны раз пры абмеркаванні ўсіх істотных законапалажэнняў». А калі рэформа самакіравання немагчыма, ён прапанаваў пакінуць у заходніх губернях земскіх начальнікаў і земскія суды, паколькі мясцовыя суды ў новых умовах маглі стаць «часткай адміністрацыйнага самавольства».

М. А. Венслаўскі вярнуўся да аграрнага пытання і, праводзячы ў жыццё рашэнні прэзідыума Кола, заявіў, што землеўпарадкаваныя камісіі ў Заходнім краі не карыстаюцца даверам насельніцтва, бо ў іх складзе большасць чыноўнікаў і адсутнічаюць землеўладальнікі. «І як у такім разе праводзіць аграрную рэформу?» — ставіў пытанне дэпутат. І сам даваў адказ: «Толькі пасля ўвядзення земстваў» [14, стб. 1574—1580].

Даволі стрыманыя ў сваіх думскіх выступленнях палякі далі волю рэзкім выразам пасля яе разгрому. Р. Дмоўскі падвёў вынікі дзейнасці палякаў у II Думе і практычна даваў наказ дэпутатам III Думы: «Народ Царства Польскага, які належыць да еўрапейскай культуры, не можа мірыцца з азіяцкай дзяржаўнасцю Расіі, гэтай новай Візантыі, і павінен імкнуцца, каб яго «пасольства» (дэпутаты. — *М. З.*) вялі няспынную барацьбу з ворагамі палякаў — з рускай нацыянальнай ідэяй» [13, с. 66].

Прадстаўнікі польскага нацыянальнага руху ад Беларусі і Літвы занялі ў Думе 10 дэпутацкіх крэслаў. Сярод іх пераважалі краёўцы і прыхільнікі эндэцыі. Яны стварылі ў Думе Кола польскіх дэпутатаў-канстытуцыяналістаў Літвы і Русі. У працэсе работы Думы дэпутаты Кола дзейнічалі салідарна з Польскім колам. Яны ў Думе знайшлі падтрымку толькі ў кадэтаў і выклікалі нападкі з боку чарнасоценцаў, акцябрыстаў і правых дэпутатаў ад Беларусі.

Ва ўмовах разгорнутага наступлення контррэвалюцыі, у час выбарчай кампаніі ў Дзяржаўную думу другога склікання, кіраўнікі БСГ пачалі выдаваць у Вільні новую, больш памяркоўную ў параўнанні з «Нашай доляй», газету «Наша ніва». Іван і Антон Луцкевічы разам з Аляксандрам Уласавым узначалілі рэдакцыю газеты, якая стала «генеральным штабам» усяго беларускага адраджэнскага руху [15]. У першым нумары ад 10 лістапада 1906 г. «Наша ніва» абвясціла, што будзе служыць «усяму беларускаму скрыўджанаму народу» і справе яго нацыянальнага адраджэння. Ставілася задача, каб «усе беларусы, якія не ведаюць, хто яны ёсць, зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб пазналі свае правы». У гэтым жа нумары быў

змешчаны артыкул «Выбары ў Дзяржаўную думу», з якога вынікала, што вырашэнне важнейшых сацыяльна-эканамічных пытанняў «Наша ніва» звязвала ўжо не з рэвалюцыяй, а з Дзяржаўнай думай [16]. «Дума не ашукае народ, — пісала газета ў наступных нумарах, — яна ўсё зробіць, каб споўніць народныя жаданні» альбо «... увесь народ, змучаны небывалым уціскам, чакае, што Дума дасць свабоду, лепшыя парадкі, зямлю, паложыць канец крыўдзе народнай» [17].

На старонках «Нашай нівы» падкрэслівалася значнасць існавання I Думы, якая «намеціла многа новых законаў і пачала іх апрацоўваць, але яе разагналі і не далі скончыць гэту работу» [18]. Вялікія надзеі ўскладаліся на II Думу, але перш-наперш увага акцэнтавалася на выбарчай кампаніі з тым, каб ад Беларусі ў расійскі «парламент» трапілі сапраўдныя абаронцы працоўных. Менавіта для будучых выбарных у Думу газета надрукавала 22 снежня 1906 г. наказ, які па сутнасці з'яўляўся праграмай паляпшэння становішча малазямельных і беззямельных сялян. Дэпутаты павінны былі дабівацца ў Думе скасавання тых законаў, якія не дазвалялі свабодна купляць і прадаваць зямлю; ліквідацыі цераспалосіцы «шнуроў» і сервітутаў («без крыўды для працуючых») у землекарыстанні сялян праз стварэнне фальваркавых або хутарскіх гаспадарак; увядзенне мясцовага самакіравання ў валасцях, паветах і губернях і прадастаўленне асобага самакіравання для Беларусі з соймам, выбраным усеагульным, роўным, тайным і простым галасаваннем; адмены ўскосных падаткаў і ўстанаўлення адзінага прагрэсіўнага падаходнага падатку; увядзенне ўсеагульнай абавязковай бясплатнай адукацыі з забеспячэннем права і магчымасці вучыцца на роднай мове [19].

Выбарчую кампанію ў II Думу «Наша ніва» называла «перадвыбарнай вайной», якую развязалі мясцовыя «истинно-русские» і «истинно-польские» людзі. З нумара ў нумар газета пісала аб тым, што чорная сотня, ці «истинно-русские», узурпіруюць уладу, цкуюць адзін народ на другі, рускіх на яўрэяў і палякаў, сілаю імкнуцца пасварыць усе народнасці, і «прыдушыўшы кожны народ паасобку, завесці панаванне багачоў і чыноўнікаў над усімі краямі, што да Расіі належаць». Падагульняючы шматлікія звесткі, «Наша ніва» паведамляла, як ашуканствам і абяцаннямі даць зямлю правыя імкнуцца перацягнуць мужыкоў у свой лагер [20]. Так, з Навагрудскага павета пісалі, што чарнасоценныя газеты, такія, як «Россия» і «Минское слово» «то поп у царкве раздае, то пісар у валасці». Але сяляне гэтых газет не чыталі, пакольні яны «не пісалі аб неабходнасці надзялення сялян зямлёй [21].

У красавіку 1907 г. у Вільні з'явілася яшчэ адна крайне-правая газета «Морская волна». Карэспандэнты «Нашай нівы» не ўпусцілі з поля зроку гэту «падзею» і тлумачылі, што «истинно-русские» ездзяць па вёсках, раздаюць «Морскую волну» і падманам, што яны стаяць за сялян, запісваюць апошніх у свой «Союз». «Такой бессаромнай газеты, як «Морская волна», — пісала «Наша ніва», — у Вільні яшчэ не было. Яна цкуе адзін народ на другі, абвінавачвае ўсіх, хто хоць крыху стаіць за праўду» [22]. Тлумачачы сялянскім выбаршчыкам неабходнасць таго, каб выбіралі «не ворагаў беларускага народу», «Наша ніва» пісала: «... інакш чорныя сотні і ворагі народнай свабоды запануюць над усім нашым краем» [23].

Літаральна з першага нумара «Наша ніва» выкрывала і сутнасць дзейнасці на Беларусі польскіх нацыяналістаў, якія «сеялі сварку і нянавісць паміж католікамі і праваслаўнымі беларусамі». «І ў выніку, — канстатавала гэта газета,— няма адзінства сярод беларускіх сялян: адны пайшлі да «истинно-русских», другія — да «истинно-польских» людзей. А розніца паміж імі тая, што адны цягнуць у бок Масквы, другія — у бок Варшавы, а ўсе разам імкнуцца захапіць у свае рукі цёмны народ наш ды спакойна абдзіраць яго» [24].

Такім чынам, друкаваны орган БСГ даваў парады сялянскім выбаршчыкам не паддавацца на агітацыю вялікарускіх шавіністаў і польскіх нацыяналістаў, а таксама тых, хто іх падтрымліваў у заходніх губернях.

На думку мясцовых карэспандэнтаў газеты, будучыя дэпутаты II Думы ад Беларусі павінны былі наведваць валасці і паветы, праводзіць сходы і «аб'яўляць, што яны будуць рабіць у Думе, а таксама час ад часу дасылаць лісты выбаршчыкам, як гэта рабіў дэпутат I Думы Кандрашук» [25].

У працэсе выбарчай кампаніі кіраўнікі БСГ заклікалі сялянскіх выбаршчыкаў падтрымліваць «мужыкоў-сацыялістаў», яднацца з гарадскімі і не прапускаць у Думу памешчыкаў [26]. У нумары ад 25 студзеня 1907 г. газета з задавальненнем паведамляла, што выбаршчыкі па валасцях і гарадах выбіраюць прагрэсіўных людзей, «мужыкоў-сацыялістаў — людзей разборных, якія добра разумеюць, якой дарогай неабходна крочыць, каб вывесці народ да свабоды і справядлівых парадкаў» [26].

Выступаючы супраць заяў чарнасоценцаў, што яўрэі жывуць і багацеюць за кошт працоўнай беднаты, газета «Наша ніва» не раз звярталася да апісання цяжкага становішча яўрэйскіх рабочых

у гарадах і мястэчках Беларусі і адзначала, што «яўрэі, за выключэннем жмень багацеяў, жывуць яшчэ горш, і наша працоўная беднята павінна не «граміць» яўрэйскіх бедалаг-рабочых, а разам з імі дабівацца лепшага жыцця» [27]. Гэта азначала, што трэба выступаць адзіным фронтам на выбарах супраць памешчыкаў. Як падкрэслівала «Наша ніва», «з месца лепш пасылаць у Думу жыда з галавой, чым безгаловага хрысціяніна, хоць і дзядзьку роднага» [26].

Непрыязныя адносіны да памешчыкаў тлумачыліся і тым, што апошнія ўмела выкарыстоўвалі сваю колькасную перавагу, дараваную выбарчым законам, свой уплыў на сялянскіх выбаршчыкаў і праводзілі ў Думу такіх дэпутатаў, якія б не ўзнімалі зямельную праблему. У паведамлені аб выніках выбараў у Віцебскай губерні з жалем падкрэслівалася, што «мужыцкія выбаршчыкі паслухалі паноў і ксяндзоў і большая іх частка, злучыўшыся з памешчыкамі, правяла ў Думу Я. П. Быкава, Ф. І. Петрачэнку і Э. А. Казарыча (членаў «РОС»), якія не будуць клапаціцца аб лепшым жыцці для ўсяго народу» [17]. І ўсё ж «Наша ніва» разлічвала на тое, што частка сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі, якія прайшлі як правыя, у Думе далучацца да трудавікоў. У дзень адкрыцця Дзяржаўнай думы II склікання газета вітала дэпутатаў і выказвала спадзяванні на іх плённую працу на карысць працоўных [28]. БСГ працягвала і нелегальную дзейнасць. У канцы 1906 — першай палове 1907 г. было выдадзена некалькі падпольных брашур і лістовак рэвалюцыйна-дэмакратычнага зместу з наступнымі назвамі: «Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць», «Забастоўка», «Чы будзе для ўсіх зямлі» і іншыя [29]. Разглядаючы аграрнае пытанне ў час работы II Дзяржаўнай думы, «Наша ніва» неаднаразова адзначала, што ў Беларусі казённай, удзельнай, манастырскай, царкоўнай і касцёльнай зямлі так мала, што задаволіць ёю патрэбы сялян было немагчыма. У сувязі з гэтым газета крытыкавала пазіцыю думскіх дэпутатаў ад памешчыкаў Беларусі, якія «частавалі беднату толькі гэтай зямлёй» і стаялі за недатыкальнасць памешчыцкага землеўладання. Газета заклікала зямлю браць, «дзе выпадае, і прымусам ад памешчыкаў» [30]. У нумары ад 18 мая быў надрукаваны «Праект зямельнай рэформы», прапанаваны ў Думе літоўскімі сацыял-дэмакратамі.

Цэнтральны орган беларускага адраджэнскага руху пільна сачыў за выступленнямі ў Думе дэпутатаў ад Беларусі, рэгулярна змяшчаў на сваіх старонках вытрымкі з прамоў трудавікоў, кадэтаў, сацыял-дэмакратаў, абраных ад іншых рэгіёнаў Расіі. «Але аб нашым краі, — пісала «Наша ніва», — не ўпамянуў ні адзін дэпутат. Ніхто не сказаў аб тым, як цяжка жывецца народу ў Беларусі, што неабходна для нашага краю». Газета абуралася паводзінамі мінскіх сялянскіх дэпутатаў В. М. Мельніка і П. Ф. Грудзінскага, якія яшчэ далей пайшлі за правымі, і бяздзейнасцю гродзенскіх дэпутатаў. «Наша ніва» паведамляла, што дэпутаты ад Украіны аб'ядналіся ва «ўкраінскую трудавую грамаду», выдаюць газету і падтрымліваюць цесныя сувязі са сваімі выбаршчыкамі. «А нашы, — тлумачыла газета, — не маюць нічога агульнага з тымі людзьмі, хто паслаў іх у Думу пастаяць за наш край». І з жалем заключыла: «Праўда, відаць, кажуць, што народ беларускі найцямнейшы ды найбольш прыбіты: такіх ён і дэпутатаў выбраў» [30].

24 лютага «Наша ніва» надрукавала артыкул «Зямельная справа ў Новай Зеландыі», у якім акцэнтавала ўвагу на тым, што гэтай зямлёй кіруе Рада з народных дэпутатаў, выбраных агульным, простым, поўным і тайным галасаваннем без уліку іх веры, народнасці і полу. Тут жа быў змешчаны артыкул «Дума і народ», дзе фактычна праводзілася параўнанне паўнамоцтваў членаў Рады ў Новай Зеландыі і дэпутатаў Расійскай думы. У дадзеным выпадку «Наша ніва» падводзіла чытачоў да разумення неабходнасці заваёвы ўлады народам і перадачы яе Народнай Радзе, над якой бы не было цара, міністраў, Дзяржаўнага Савета [28].

Можна канстатаваць, што выбарчая кампанія ў II Дзяржаўную думу знайшла грунтоўнае асвятленне на старонках газеты «Наша ніва». Супрацоўнікі рэдакцыі і карэспандэнты рабілі шмат для таго, каб беларускае сялянства знайшло правільны выбар пры вылучэнні ўпаўнаважаных і выбаршчыкаў, не абіралі «истинно-русских» і «истинно польских» людзей, асабліва памешчыкаў. Газета заклікала яднацца на выбарах з гараджанамі і ўскладала вялікія надзеі на Думу ў справе вырашэння аграрнага пытання. Гэтыя надзеі перадаваліся сялянству. Як вынік на старонках газеты друкаваліся шматлікія заявы сялян, якія былі накіраваны ў Дзяржаўную думу. Вось тэкст аднаго з іх: «Мы, ніжэй паставіўшыя подпісы, 35 сялян Сычоўскага сельскага таварыства, Брэсцкага павета, Гродзенскай губерні 17 красавіка на сельскім сходзе пастанавілі: 1) мы ад шчырага сэрца верым Дзяржаўнай думе; 2) калі наступіць час, падтрымаем яе ўсімі нашымі сіламі». Такую ж заяву паслалі ў Думу 29 сялян Стаўскага сельскага таварыства таго ж павета [31].

«Наша ніва» пісала аб тым, што на выбарах у Расіі праходзяць у Думу дэпутаты-сацыялісты, якія стаяць за народную свабоду і з жалем паведамляла, што ад Беларусі, Польшчы,

Заходняй Украіны выбралі членаў ці прыхільнікаў правых партый, польскіх нацыяналістаў, святароў, якія « не будуць стаяць за лепшую долю для працоўнага народу» [20].

Рэдакцыя газеты і яе супрацоўнікі зразумелі, што ва ўмовах існавання царскай манархіі II Дума наўрад ці вырашыць галоўныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця краіны. У некаторых артыкулах у першай палове 1907 г. газета практычна заклікала да яе звяржэння і ліквідацыі памешчыцкага землеўладання. Практычна такі ж настрой панаваў і ў Думе. Царызм быў гатовы да такога павароту падзей.

У сталіцу пасылаліся тэлеграмы манархічных партый і саюзаў з патрабаваннем яе разгону. Такая тэлеграма на імя П. А Сталыпіна была накіравана і ад «рускай» грамадскасці Мінска [10]. Епіскап Мінскі Міхаіл разаслаў тэлеграмы па сваёй епархіі ў сувязі з магчымым роспускам Думы наступнага зместу: «Яднайцеся, рускія людзі, яднайцеся святары, рыхтуйцеся са сваімі духоўнымі дзецьмі даць энергічны адпор ваўкам у авечай скуры, якія называюць сябе прагрэсіўнымі людзьмі і імкнуцца праўваца да ўлады і гаспадарыць у краіне на сваю карысць» [32].

1 чэрвеня 1907 г. П. А. Сталыпін запатрабаваў пазбавіць дэпутацкіх паўнамоцтваў усю сацыял-дэмакратычную фракцыю (55 членаў Думы) па абвінавачванні ў дзеяннях, прадугледжаных 1-й часткай 102-га артыкула «Крымінальнага кодэкса», а ў адносінах да 16 дэпутатаў дазволу на арышт. Дума прапанавала стварыць камісію з 32 чалавек для разгляду справы, што адтэрміноўвала заключэнне да 4 чэрвеня. Урад і Мікалай II не пажадалі дачакацца адказу на свой ультыматум. Указам ад 3 чэрвеня 1907 г. Дзяржаўная дума другога склікання была распушчана.


## Summary

The political stance of representatives of governmental parties from Belarus in the Second Russian State Duma (February—June, 1907) has been revealed, activities of Polish-Belarussian autonomists and attitude of the Belarussian national movement to the Russian parliament have beer analysed


## Літаратура


1. Б і ч М. В. Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. I. С. 398—400.
2. РДГА, ф. 1278, воп. 1, спр. 399, арк. 19.
3. Состав трудовой группы в I и II Государственной думах. Сводная таблица членов фракции. М., 1988. С. 106.
4. Окраины России. 1907. 3 марта.
5. Государственная дума. 1907. Стенографические отчеты. Созыв II. Сессия II. Т. I. Стб. 112.
6. ДАРФ, ф. 522, воп. 1, спр. 2, арк. 23.
7. М а с л о в С. Л. Земельный вопрос и партии во II Государственной думе в 1907 г. М., 1917. С. 22—24.
8. Земля и воля. 1907. 15 марта.
9. Минское слово. 1907. 9 марта.
10. Могилевский вестник. 1907. 14 марта.
11. Kurier Litewski. 1907. № 110.
12. Речь. 1907. 20 апр.
13. В а с и л ь е в Н. П. Вторая Дума. СПб., 1907.
14. Государственная дума. 1907. Стенографические отчеты. Созыв II. Сессия II. 1907. Т. II. Стб. 942.
15. Л у ц к е в і ч А. За дваццаць пяць гадоў (1903—1928). Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый. Беларуская сацыялістычная грамада. Вільня, 1928; Мн., 1991. С. 37—38.
16. Наша ніва. 1906. 10 ліст.
17. Наша ніва. 1907. 18 лют.
18. Наша ніва. 1907. 6 крас.
19. Наша ніва. 1906. 22 снеж.
20. Наша ніва. 1907. 11 лют.; 13 крас.
21. Наша ніва. 1907. 13 крас.
22. Наша ніва. 1907. 20 крас.
23. Наша ніва. 1906. 24 ліст.
24. Наша ніва. 1907. 23 крас.
25. Наша ніва. 1907. 2 лют.
26. Наша ніва. 1907. 25 студз.
27. Наша ніва. 1907. 7 мая.
28. Наша ніва. 1907. 24 лют.
29. Б і ч М. В. Барацьба за нацыянальнае адраджэнне // Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. I. С. 419—420.
30. Наша ніва. 1907. 18 мая.
31. Наша ніва. 1907. 11 мая.
32. Северо-западный голос. 1907. 13 апр.



*Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт*



*Паступіў у рэдакцыю 02.02.99*